***Бел.***: пераліваць з пустога ў парожняе; таўчы ў ступе ваду; нагаварыў мех і торбу; пустая гаворка дарагі час занімае.

***Лац.***: Qui pro quo («адзін замест другога»)

***Бел.***: гэты пра воз, а той пра коз; хто ў боб, а хто ў гарох; хто ў лес, хто па дровы.

Супастаўляльнае вывучэнне крылатых выразаў у пэўнай ступені з'яўляецца супастаўляльным даследаваннем розных культур. Уключэнне ў працэс навучання агульнакультурнага кампанента дае магчымасць студэнтам далучыцца да скарбонкі культуры Старажытнага Рыма і вучыць іх параўноўваць розныя культуры. Знаёмства са старажытнай культурай робіць успрыманне іншых культур больш дакладным, глыбокім і ўсебаковым. Менавіта агульнакультурны кампанент навучання ўключае студэнтаў у дыялог культур, знаёміць з дасягненнямі нацыянальнай культуры ў рэчышчы агульначалавечай. Такім чынам праводзіцца прамая сувязь ад антычнасці да нашых дзён, і значэнне лацінскай мовы ў гэтым бесперапынным гістарычным ланцужку як інструмента культуры аказваецца значна большым, чым любой іншай еўрапейскай мовы.

1. Бабичев, Н.Т. Словарь латинских крылатых слов / Н.Т. Бабичев, Я.М. Боровский. – М., 1982.

2. Булыка, А.М. Слоўнік іншамоўных слоў: у 2 т. / А.М. Булыка. – Мінск : БелЭн, 1999.

3. Дворецкий, И.Х. Латинско-русский словарь / И.Х. Дворецкий. – М. : Рус. яз., 2000.

4. Proverbia et dicta: Шасцімоўны слоўнік прыказак, прымавак і крылатых слоў/ Н.А. Ганчарова [і інш.] ; пад. рэд. Н.А. Ганчаровай. – Мінск., 1993.

**Л.М. ГРЫЦУК** (Брэст, Беларусь)

## ЭЛЕГІЯ ЯК МЕНТАЛЬНЫ ЖАНР БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ: НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ

Эпоха росквіту і прыярытэтнасці элегіі як жанру ў беларускай літаратуры прыпадае на першую трэць XX стагоддзя, хоць выразныя выявы гэтага жанру назіраюцца і ў XIX стагоддзі (многія польскамоўныя творы В. Дуніна-Марцінкевіча і Ф. Багушэвіча, напрыклад). Некаторыя даследчыкі (У.В. Гніламёдаў, І.Э. Багдановіч, У.М. Казбярук) звязваюць станаўленне і развіццё элегіі ў сучасных формах з рамантызмам, спасылаючыся на тое, што рамантычны пафас вельмі часта (калі не заўсёды) вызначае элегічны змест і настрой. Рамантычны пафас – гэта пафас непрыняцця, адмаўлення існуючых, неспрыяльных для чалавека абставінаў. Падобны ваяўнічы настрой становіцца «рухавіком» суму, пачуцця адзіноцтва, расчаравання – тых фактараў, якія вызначаюць змястоўнасць элегіі. Адсюль і сувязь паміж рамантычным непрыняццем, памкненнем да новай існасці і элегічнай унутранай (псіхалагічнай) неўладкаванасці. У пазначаны намі час для беларусаў адкрылася магчымасць адрадзіцца, выкарыстаць момант грамадскага ўзрушэння і абнаўлення і павесці змаганне за тое, каб «людзьмі звацца», выгукнуць на ўвесь

свет сваё імя – «Беларусы!». Падобная сітуацыя сталася глебай рамантычных спадзяванняў, надзей, памкненняў. Але спраўдзіцца яны маглі толькі праз пераадоленне сацыяльнага і нацыянальнага ўціску з боку мацнейшых суседзяў і сваёй пасіўнасці, абыякавасці да аднаўлення і захавання «роднага карэння» (па трапным выказванні Максіма Гарэцкага), сваёй ментальнасці.

Паводле тлумачальнага слоўніка, менталітэт – гэта «светаўспрыманне, настрой думак». На пачатку XX стагоддзя характар паэзіі ў многім залежаў ад адчування яе аўтарамі ментальнасці характару нацыі, спачування лёсу народа, лепшыя сыны якога шукалі шляхоў выйсця з трагічнай сітуацыі. Грамадска-палітычнае становішча ў Беларусі ў гэты час было вельмі складанае, а пераважная колькасць людзей была ахоплена летаргічным сном, настроем абыякавасці. Запаволенае развіццё нацыянальнай культуры, літаратуры, якое пачалося яшчэ ў часы ВКЛ пасля забароны беларускай мовы, аказалася даволі працяглым па часе. Беларускія паэты і пісьменнікі нават у пачатку XX стагоддзя яшчэ часам свае творы падводзілі пад польскую «этыкетку». Але ўзнікненне выдавецкіх таварыстваў, з'яўленне БСГ і іншых грамадскіх і культурных суполак спрыяла адраджэнню ў свядомасці людзей паняццяў «беларус», «беларускае», «беларускасць», чуцця гераічнага мінулага.

Мастацкія творы з элегічным настроем з'явіліся ў нашай нацыянальнай літаратуры яшчэ ў «дарамантычны» час. «Трэнас, або Плач усходняй царквы» Мялеція Сматрыцкага – палемічны твор, наскрозь прасякнуты трагічным пафасам, выдадзены ў Вільні на польскай мове ў 1610 годзе пад псеўданімам Тэафіла Арталога. Пісьменнік вобразнай мовай апісвае царкоўна-рэлігійныя адносіны і становішча праваслаўнай царквы ў дзяржаве. Паказана трагедыя народа, які змагаецца з каталіцка-уніяцкім наступам. Праваслаўная царква-маці пакутуе і плача: «Няхай жа кране цябе сыноўскае спачуванне да сваёй маці; няхай уразіць тваё сэрца гэты такі горкі і ў самі нябёсы пранікаючы *плач*, маё *ўздыханне* і *галашэнне*!» (курсіў Л.М. Грыцук) [1, с. 633]. Яшчэ адзін твор М. Сматрыцкага «Казанне на пахаванне Лявонція Карповіча» (1620) – помнік царкоўна-рэлігійнай аратарскай прозы эпохі Барока. Аўтар акрэслівае асноўныя палажэнні праваслаўнага веравучэння, спрабуе растлумачыць чалавечае жыццё і смерць з пункту гледжання законаў прыроды і грамадскага мыслення. Лявонція Карповіча М. Сматрыцкі лічыць сваім духоўным бацькам і аплаквае яго, апісваючы як набожнага чэснага чалавека: «Кламства, фалшу, здрады, подступку, потвары, пыхи, самолюбства, лакомства, зазрости, речий добрых ненависти отинудь не знал. Скромность зась, трезвость, покора, людскость, укладность, склонность, литость, милость, а наособливей щирость, правда и любов в души его вечное собе мешкане услали» [1, с. 638].

У старажытнай літаратуры такія творы, як «плач», «казанне», былі вершаванымі. Нягледзячы на гэты канон, можа, як гэта здарылася з Мялеціем Сматрыцкім, элегічны модус мастацкасці (А. Зыранаў) праяўляецца і ў прозе. Элегічны тып «миропереживания», як і ў лірыцы ў цэлым, дае магчымасць аўтарам пераасэнсаваць мінулыя падзеі, спраецыраваць іх на цяперашні час.

Многія беларускія пісьменнікі ў сваіх творах выказвалі боль за Радзіму. З мэтай абараніць хрысціян ад наступу ўсходняй рэлігіі напісаў наступныя радкі Мікола Гусоўскі ў «Песні пра зубра» (1523): «Войны вядзем мы адзін на адзін за свяшчэнны / Братні саюз хысціянства з навалай з усходу. / Вораг страшэнны адольвае нас і зламысна / Рэжа пад корань наш род і вучэнне Хрыстова / Ў душах народаў на ўсіх заняволеных землях» [1, с. 356]. У «Дыярыушы» (сярэдзіна XVII) Афанасія Філіповіча таксама адлюстроўваецца барацьба беларускага народа за свае нацыянальныя і рэлігійныя правы, традыцыі, культуру. Праваслаўны народ церпіць уціск з боку уніятаў і туркаў, аўтар падкрэслівае, што «не барзо тебе Рим прагнет и латина, Може бовем обыйтися рез русина». Заклікае: «Навернися до всходней / Церкви своей святой». За кожнага уніята моліцца маці: «Просит за тя з *плачем* (курсіў Л.М. Грыцук) горким в трубе страшной / Матка сына в крижу, мовячи мне, – «Жалосной / Тепер человек ласку мает», / Напотом болш не узнает» [1, с. 789]. Гэта твор, прасякнуты элегічным настроем. Лірычны герой «Дыярыуша» – змагар, барацьбіт, абаронца роднага краю. Ён выступае супраць пануючых у дзяржаве каталіцкай і уніяцкай цэркваў, знешняй і ўнутранай палітыкі Рэчы Паспалітай.

На пачатку XX стагоддзя, пад уздзеяннем рэвалюцыі 1905 года і іншых падзей, дасягае кульмінацыі працэс Адраджэння на беларускіх землях. Аднак яшчэ ў 80-я гады XIX стагоддзя беларускамоўныя творы пачынаюць друкавацца на старонках расійскіх газет, фарміруецца новае пакаленне інтэлігенцыі, якая адчувае сваю «беларускасць». Такім чынам, менавіта абуджэнне свядомасці людзей і сталася найперш грунтам адраджэння «забранага краю», калі выкарыстаць купалаўскі выраз. Але працэс беларускага адраджэння праходзіў вельмі складана. Адразу памяняць абставіны і асабліва псіхалогію людзей, якія стагоддзямі, найбольш ў XVIII-XIX-м, прывучваліся да таго, што яны мужыцкага роду і звання, не такія, як мацнейшыя суседзі, было немагчыма. І тут найпершую ролю павінна было адыграць слова, мастацтва.

Некаторыя літаратуразнаўцы лічаць, што Янка Купала быў паэтам-рэалістам, таму што яго бачанне жыцця і прыроды «звязана з канкрэтнымі прадметамі, рэчамі, з’явамі» [6, с. 44]. В.У. Івашын з гэтай прычыны піша, што пачынаў паэт сваю творчасць як рэаліст, што Ф. Багушэвіч у канцы 19 стагоддзя замацаваў рэалізм як галоўны напрамак беларускай літаратуры другой паловы 19 стагоддзя, а Купала прадоўжыў замацаванне эстэтычных прынцыпаў, закладзеных заснавальнікам якасна новага этапа развіцця літаратуры [4].

Менавіта вера ў абуджэнне народа ад сну сталася адной з прычын узрастання ролі рамантычнага пачатку ў творчасці паэта і публіцыста Янкі Купалы. Калі б яна страцілася ці выяўлялася мінімальна, каб не ўзняўся паэт на хвалю рамантычнай веры ў будучыню «забранага краю», а абмежаваўся толькі сатырычным выкрыццём адмоўных з’яў, ён застаўся б таленавітым, працуючым «пад Багушэвіча» аўтарам. Рамантызм памкненняў, прагназаванне адметнасці Беларускага Шляху вылучылі Янку Купалу з асяродку пісьменнікаў-рэалістаў на першую пазіцыю. Аўтар «Жалейкі», «Гусляра», «Шляхам жыцця» становіцца прарокам нацыі. Рамантычныя творы Янкі Купалы жывіліся з’явамі з

сапраўднага грамадскага, сялянскага жыцця. Яны абуджалі свядомасць беларусаў да пераўтварэння жыцця, заклікалі прыгнечаны народ да актыўных дзеянняў. Спалучэнне рэалістычнага і рамантычнага дазваляе паэту адначасова паказаць сучаснае становішча і настроіць на ўяўленне магчымага жыцця, схіліць да яго пабудовы. Задача, якую паставіў сабе Янка Купала, – абудзіць народ ад летаргічнага сну, развянчаць міф аб прыгнечанасці, цемнаце, невуцтве, неталенавітасці беларуса. У першым зборніку «Жалейка» (1908) паэт спрабуе пашпартызаваць сялянства як беларускую нацыю, а затым ужо заклікае народ да пратэсту супраць трагедыйнага становішча. У вершах 1905–1907 гадоў толькі канстатуецца факт цяжкага лёсу беларусаў, пазней паказваецца іх здольнасць пастаяць за сябе, адзначаюцца эпізоды з жыцця, калі беларускія сяляне «касой рэзалі ўрагоў». «Купалаўскую «Жалейку» без перабольшання можна назваць кнігай элегій, а элегічнасць вылучыць як пафас яе, як агульны настрой» [2, с. 30], – так піша літаратуразнаўца І.Э. Багдановіч.

Хто Янка Купала ў большай ступені: рамантык ці рэаліст? Сцверджанне У.М. Казбярука выклікае спрэчкі паміж літаратуразнаўцамі наконт рэалістычных і рамантычных рыс у творчасці Янкі Купалы: «Аблічча беларускай літаратуры вызначыў сінтэз рэалізму і рамантызму з перавагай у паасобныя моманты то аднаго, то другога напрамку» [5, с. 13].

Пасля рэвалюцыі 1905 года Янка Купала піша многа элегічных твораў. Жанр элегіі пазбаўляе аўтара ад залежнасці часавай і прасторавай, такім чынам, элегія застаўляе перажываць, але не суадносіць гэтае перажыванне з канкрэтнымі рэчамі, з'явамі, яна па-за межамі актыўнага жыцця. Гэта дазваляе па-філасофску падыходзіць да асэнсавання падзей і асобы чалавека ў свеце. Элегія – медытатыўны твор, які спрабуе прывесці псіхіку чалавека ў стан паглыбленасці і сканцэнтраванасці. Г.М. Паспелаў [7] падзяляе медытатыўную лірыку на тры разнавіднасці: рэфлексіўна-медытатыўную, адцягнена-медытатыўную і медытатыўна-выяўленчую. Разгледзім элегічныя вершы Янкі Купалы ў адпаведнасці з падобнай класіфікацыяй, бо жанр элегіі – складнік медытатыўнай паэзіі.

У вершах «Адзін», «Шчасце», «Да песень», «Песня вольнага чалавека», «З людзьмі» і іншых Янка Купала раскрывае балючы стан сваёй душы, дае магчымасць чытачу перажыць, як свае, паэтавы асабістыя перажыванні: «Трудна, крыўдна жыць на свеце / Між нячулымі людзьмі, / Не раз вочы маладыя / Заліваюцца слязьмі». Пачуцці лірычнага героя ў дадзеных творах шырэйшыя, чым пакуты аднаго чалавека, тыповыя, абумоўленыя асаблівасцямі нацыянальна-гістарычнага жыцця. Яны ўласцівыя многім людзям-працаўнікам. Змест рэфлексіўна-медытатыўнай элегіі, дзякуючы гэтаму, набывае ўсеагульнае значэнне.

Прыкладам адцягнена-медытатыўнай, філасофскай лірыкі, прадстаўленай жанрам элегіі, могуць быць вершы Янкі Купалы «Пашкадуй мужыка», «Працуй», «Зіма», «Ах, ці доўга… », «Над магіламі». Абагульнены, безыменны лірычны герой асобнымі рысамі ўдакладняе і без таго яркі вобраз мужыка-беларуса, «бедачышчы»: «Як асенняя ноч, як туман, / Цёмны сам, цёмна ў хатцы крывой; / На плячах абарваны лахман, / Ногі ўкручаны цвёрдай лазой». Паэт

спрабуе раскрыць сацыяльную свядомасць такога тыпу беларуса: «Хто тут вінен, разгадайце, / Ці тут Бог, ці чорт пракляты? – / Але толькі, што ні байце, / Самі ж многа вінаваты!..».

Адной з разнавіднасцей элегій Янкі Купалы з'яўляюцца элегіі пра каханне. Каханне да жанчыны (верш «Да N.»), якой «шмат пражылося», своеасаблівае. Паэт піша пранікнёна і захоплена: «люблю, як сястрыцу сваю дарагую, / Шаную, як родную матку сваю». У вершы «Шуміць шумненька гаёк» пра сваё пачуццё расказвае ролевая гераіня, дзяўчына, якая сумуе без каханага, нават ноччу спаць не можа, «як з жалю якога». Памяншальна-ласкальны зварот да каханага («дзецючок»), параўнанне («твар чырвоны, як маліна») дапамагаюць паэту стварыць выразны партрэт закаханай.

Вершы Янкі Купалы пра каханне наскрозь прасякнутыя смуткам. Па праву іх можна назваць вершамі-жальбамі. Паэтава каханне да «дзяўчыны-галубкі» (верш «На адвітанне») не можа больш доўжыцца, таму што яго «недруг вырваў, спаганіў, спаткаў». «Адзін, як над рэчкай вярбінка», лірычны герой і ў вершы «Адзін» чакае, што «прыйдзе хтось любы, / Абніме, атуліць сабой». Матыў «самоты» гучыць у многіх іншых элегічных творах Янкі Купалы. Адзінокія і мужык-беларус, і жанчына-ўдава. «Сіротка-ўдава» ў сваім жыцці бачыць толькі няпраўду, злосць, крыўду, здзекі. Трагізм лёсу гераіні ўзмацняецца яшчэ і тым, што ніхто дапамагчы ёй і яе дзецям не можа. Рэфрэн «Душа мне і шэпча, і плача: / Адзін ты, адзін, небарача! » закранае душу і сэрца чытача. Згаданыя радкі можна браць эпіграфам да многіх вершаў Янкі Купалы. Матывы кахання ў пазнейшай лірыцы паэта (да прыкладу, у вершах са зборніка «Шляхам жыцця») часам звязаны з матывамі вітання маладой Беларусі.

Жальба Янкі Купалы як зыходная матывацыя элегічнага пафасу і настрою была не толькі вынікам адчування паэтам цяжкага лёсу беларускага народа, але і сведчаннем філасофскай ацэнкі жыцця ў цэлым. Вельмі часта, нават у межах асобнага твора, жаласлівасць лучылася з упэўненасцю ў пераадоленне драматычных абставін, з верай у магчымыя змены да лепшага. У выніку падобнага паяднання разнавіднасцей пафасу нараджаліся новыя жанравыя мадыфікацыі: элегія з элементамі оды («Калі пачнуць») і ода з элементамі элегіі («Годзе…»).

Л.Я. Гаранін сцвярджае, што «песня ў свядомасці беларуса – гэта яго апаэтызаваны лёс, яго памяць і яго духоўная апора ў самых розных сітуацыях жыцця, гэта значыць, яна выступае як неад'емная рыса яго нацыянальнага характару» [3, с. 142].

Многія Купалавы вершы паводле разгорнутасці сюжэта, матывацыі нагадвалі народныя песні – тужлівыя, сумныя, сінанімічныя элегіям пра каханне, сіроцтва, адзіноцтва, здраду і г. д.

У вершы «Каму вас, песні?.. » паэт сцвярджае, што чужакам мы сваіх песень не дадзім, бо ў песнях мужыцкіх «шмат праўды чуваць». Верш «Град» – гэта элегічны твор ліра-эпічнага характару. Наяўнасць у творы падзейнай сюжэтнай лініі дае магчымасць сцвярджаць, што ён – эпічны. Аднак сюжэт гэты поўнасцю падпарадкаваны сумнаму элегічнаму настрою, літаральна

«разломваецца» ў ім і адпаведнымі гэтаму настрою вобразамі-універсаліямі: нядоля, скарга, гора, слёзы, бяда і інш.

Элегіі Янкі Купалы можна падзяліць на такія тэматычныя групы, як вершы пра каханне, сацыяльна-грамадзянскія і філасофскія.

У групе сацыяльна-грамадзянскіх па змесце элегій можна вылучыць *песні-жальбы* («Песня»), што ўзыходзяць да сярэдневяковых галашэнняў (страта сына або адвечная ўпэўненасць маці ў тым, што сына чакае цяжкае жыццё); *песні-скаргі* («Пашкадуй мужыка!»), у якіх аўтар не заклікае людзей да дзеяння, а толькі сцвярджае думку пра цяжкі лёс беларуса; *элегію-пасланне* («Брату-беларусу»), *элегію-зварот* («Свайму народу»), у якіх Янка Купала, звяртаючыся да народа, разглядае сучасны стан грамадства і кліча да паўстання; *песню-заклік* – адкрыты («Касцу», «Пакіньма напуста на лёс свой наракаць...», «Спрасоння») і прыхаваны («З маіх песень»). Нават у *элегіі-разважанні* «А ты, браце, спі!» фігуруе думка пра тое, што народ пачне канкрэтна дзейнічаць толькі пасля таго, як абудзіцца яго дух, яго свядомасць. Гэтая думка прасяквае іншыя творы. Трэба лячыць душу народа, а не толькі яго цела – так лічыць «бабулька – прадаўчыца зёлак», а разам з ёю і паэт: «А можа, паможа / Душы хоць адной дзе, / I праца бабулькі / На марна не пойдзе».

Надзея на лепшае не пакідае чалавека і ў элегіі «Зіма». Родная старонка сцерпіць усе пакуты, але ўслед за цемрай «ускрэсне зноў вясна!» Цярпенне кожнага асобнага чалавека безмежнае, яно быццам бы змяшчае «мільёнаў разам усіх цярпенне! » («Маё цярпенне»). Асананс галосных Ё, О выразна «агучвае» боль і стогн беларуса, якім прасякнуты гэты твор. Запаволенасць інтанацыі ў гэтым вершы дазваляе чытачу глыбей адчуць душэўны настрой непакою і разважлівасці, які не пакідаў Я. Купалу. Адсутнасць ў гэтым і многіх іншых творах светлых колераў падкрэслівае сацыяльнае бяспраўе народа.

Ёсць у Купалы і элегіі бунтоўныя, пратэстанцкія па настроі, з элементамі оды (матыў суму ў канцы элегіі змяняецца выбухам веры ў лепшае). Да ліку такіх можна аднесці «Час! »

Можна вылучыць і наступныя разнавіднасці жалобных элегій.

*Элегія-рэквіем* «Мая малітва» прысвечаная роднай зямлі. У творы паэт выказвае жаданне, «каб чорныя долі ... не вылі над роднай зямлёй». Падобны да згаданай элегіі і верш «Над магіламі» – плач пра бяздольных. Доля сіраты, яе кароткае цяжкае жыццё і смерць апісаны ў элегіі «З сіроцкай долі».

*Элегіі-эпітафіі* «Я не паэта», «Мая эпітафія» ўзыходзяць да антычных надмагільных надпісаў. Назіраецца пэўнае змястоўнае падабенства іх з одай Гарацыя «Exegi monumentum».

Філасофскія Купалавы элегіі пра жыццё і смерць, дабро і зло, сэнс чалавечага жыцця закранаюць вечныя праблемы. Такія элегіі часцей за ўсе ўяўляюць сабой па форме маналогі-разважанні, бо дыялогі не дазваляюць паслядоўна развіваць думку. Да ліку элегій падобнага тыпу можна аднесці творы «Званы», «Млечны шлях», «На шляху». Напоўнены філасофскім зместам пра сэнс жыцця верш «Доля ўдавы». Антонімы «шчасце–няшчасце» пачынаюць сінанімічны рад з градацыяй: злосць, крыўда, скарга, здзек.

Такім чынам, мастацкі элегічны свет Янкі Купалы шматгранны і непаўторны. Гэта адкрытая сістэма, якая ўбірае ў сябе прыкметы розных стыляў разнавіднасцей пафасу, сродкаў пісьма.

1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Інстытут літаратуры імя Я. Купалы ; падрыхт. А.І. Богдан і [інш.] ; навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Бел. навука, 2005. – 1015 с.

2. Багдановіч, І.Э. Янка Купала і рамантызм / І.Э. Багдановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 220 с.

3. Гаранін, Л.Я. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя / Л.Я. Гаранін. – Мінск : Бел. навука, 1996. – 176 с.

4. Івашын, В.У. Янка Купала. Творчасць перыяду рэвалюцыі 1905–1907 гг. / В.У. Івашын. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1953. – 207 с.

5. Казбярук, У.М. Рамантычны пошук / У.М. Казбярук. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983.

6. Пётух, А. Ад «Жалейкі» да «Шляхам жыцця» / А. Пётух. Народны паэт Беларусі. – Мінск : Выд-ва Акадэміі навук БССР, 1962. – 357 с.

7. Поспелов, Г.Н. Лирика: среди литературных родов / Г.Н. Поспелов. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1976. – 207 с.

**Е.В. ГУЛЕВИЧ** (Гродно, Беларусь)

## «ДНЕВНИК ЛИШНЕГО ЧЕЛОВЕКА» И. ТУРГЕНЕВА И «ДНЕВНИК ПЯТИДЕСЯТИЛЕТНЕГО» Г. ДЖЕЙМСА: АСПЕКТЫ ТВОРЧЕСКОГО ДИАЛОГА

Наличие творческого диалога между Тургеневым и Джеймсом несомненно. Подтверждением тому служат следующие факты: творчество русского писателя вызывало огромный интерес Джеймса уже в 1860-е гг.; в 1874 г. он публикует свою первую статью о Тургеневе; в 1875–76 гг. неоднократно встречается с Тургеневым в Париже. Джеймс «впитывал» каждое слово Тургенева и, будучи на тот момент начинающим литератором, ищущим свой вектор художественного творчества, образец художественного письма он нашёл именно в литературном опыте Тургенева. Поэтому совершенно естественным является то, что творческий опыт Тургенева преломился в художественном творчестве Джеймса в виде фундаментальной стартовой основы, которая по мере творческого развития американского писателя отшлифовывалась в более совершенную литературную форму.

Повесть Тургенева «Дневник лишнего человека» была написана в 1849 г., и сам писатель считал её вполне удавшимся произведением. Так, в письме к редактору «Отечественных записок» А.А. Краевскому он писал: «Извините мелочность этих замечаний; я почему-то воображаю, что «Дневник» хорошая вещь, и желал бы видеть её – выставленную лицом, как говорится» [1, с. 380]. Повесть написана в форме дневника, что предполагает исповедальную форму передачи событий. Главный герой – человек контрастов: лицо без имени, но с ироничной